ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

***SCIENTISTS OF BELARUS***

# АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ ЛУКАШАНЕЦ
## (Да 65-годдзя з дня нараджэння)



Сёлета спаўняецца 65 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага вучонага-лінгвіста, доктара філалагічных навук, прафесара, акадэміка НАН Беларусі Аляксандра Аляксандравіча Лукашанца.

А. А. Лукашанец нарадзіўся 23 лістапада 1954 года ў вёсцы Жураўцы Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1972 годзе скончыў Сакаўшчынскую сярэднюю школу і паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які з адзнакай закончыў у 1977 годзе.

З 1977 года А. А. Лукашанец працуе ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа (з 2008 года – дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», з 2012 года – дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі») на пасадах стажора-даследчыка, малодшага навуковага супрацоўніка, старшага навуковага супрацоўніка, вучонага сакратара (1986–1989), намесніка дырэктара па навуковай рабоце (1989–2003), выконваючага абавязкі дырэктара (2003–2004), дырэктара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2004–2008), дырэктара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2008–2012). З верасня 2012 года працуе на пасадзе першага намесніка дырэктара па навуковай рабоце дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

З 1978 па 1981 год А. А. Лукашанец з'яўляўся аспірантам Інстытута рускай мовы АН СССР. У 1981 годзе ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Словаўтваральныя гнёзды дзеясловаў у рускай і беларускай мовах (на матэрыяле адной з груп дзеясловаў канкрэтнага фізічнага дзеяння)» па спецыяльнасці «руская мова» (навуковы кіраўнік – прафесар А. М. Ціханаў). У 2001 годзе абараніў доктарскую дысертацыю «Граматычныя аспекты беларускага словаўтварэння» па спецыяльнасці «беларуская мова». Вучонае званне прафесара яму прысвоена ў 2003 годзе. У 2009 годзе абраны членам-карэспандэнтам і ў 2017 годзе – акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Асноўныя сферы навуковых інтарэсаў А. А. Лукашанца – беларускае, рускае і славянскае словаўтварэнне; супастаўляльнае даследаванне беларускай і рускай моў; праблемы ўзаемадзеяння блізкароднасных моў, моўнай палітыкі і сацыялінгвістыкі.

А. А. Лукашанец з'яўляецца адным з найбольш аўтарытэтных спецыялістаў у галіне беларускага словаўтварэння. У шэрагу навуковых публікацый і манаграфіі «Словаўтварэнне і граматыка» (Мн., 2001) ён распрацаваў тэарэтычныя асновы і ажыццявіў практычнае апісанне сістэмы беларускага словаўтварэння з пазіцый граматычных катэгорый матывавальнага і матываванага слоў, што сведчыць аб стварэнні новага навуковага напрамку ў беларускім мовазнаўстве. Вынікі навуковых пошукаў у гэтай галіне абагульнены ім у доктарскай дысертацыі «Граматычныя аспекты беларускага словаўтварэння», паспяхова абароненай у 2001 годзе.

А. А. Лукашанец з'яўляецца суаўтарам першага ў беларускай лексікаграфіі «Словаўтваральнага слоўніка беларускай мовы» (Мн., 2000), які атрымаў шырокае прызнанне ў настаўнікаў і выклад-

чыкаў беларускай мовы, а таксама «Школьнага словаўтваральнага слоўніка беларускай мовы» (Мн., 2005), суаўтарам і навуковым рэдактарам «Кароткай граматыкі беларускай мовы» (Мн., 2008). Ён напісаў цыкл артыкулаў па словаўтварэнні для энцыклапедыі «Беларуская мова» (Мн., 1994).

Другі напрамак навуковых інтарэсаў А. А. Лукашанца – гэта праблемы білінгвізму і ўзаемадзеяння моў, сацыялінгвістыка і культура беларускага і рускага маўлення. Вучоны ўдзельнічаў у выкананні некалькіх навуковых праектаў і з'яўляецца суаўтарам манаграфій: «Руская мова ў Беларусі» (Мн., 1985), «Супастаўляльнае апісанне рускай і беларускай моў. Марфалогія» (Мн., 1990), «Тыпалогія двухмоўя і шматмоўя ў Беларусі» (Мн., 1999), «Супастаўляльнае апісанне рускай і беларускай моў. Словаўтварэнне» (Мн., 2014), кнігі «Мова – палітыка – грамадства» (Мн., 1988), дапаможніка «Культура рускага маўлення ў пытаннях і адказах» (Мн., 1995) і інш. Акадэмік часта выступае з навуковымі дакладамі па праблемах беларуска-рускага моўнага ўзаемадзеяння і ўзаемаўплыву сістэм блізкароднасных моў.

У апошні час А. А. Лукашанец шмат увагі ўдзяляе даследаванню праблем развіцця беларускай мовы ў ХХ ст., яе сучаснаму стану і функцыянаванню ў грамадстве. Ён удзельнічаў у выкананні некалькіх міжнародных навуковых праектаў, з'яўляецца суаўтарам калектыўных манаграфій «Najnowsze dzieje języków słowiańskich. Беларуская мова» (Opole, 1998; суаўтар і сурэдактар) і «Komparacja systemów i funkcjonowania współczesnych języków słowiańskich. Słowotwórstwo. Nominacja» (Opole, 2003). У апошняй А. А. Лукашанец з'яўляецца аўтарам раздзелаў «Працэсы інтэрнацыяналізацыі ва ўсходнеславянскіх мовах» і «Нацыяналізацыя ў сучасных усходнеславянскіх мовах».

Гэтай жа тэматыцы прысвечаны яго даклады на XIII (Славенія, 2003) і XIV (Македонія, 2008) Міжнародных з'ездах славістаў: «Сучасныя працэсы ў словаўтварэнні беларускай мовы. Да праблемы міжмоўнага славянскага збліжэння і адштурхоўвання» і «Да праблемы міжмоўнага славянскага ўзаемадзеяння. Беларуская мова паміж рускай і польскай». На XVI Міжнародным з'езде славістаў (Бялград, 2018) ён выступіў з дакладамі «Нацыянальная графіка і арфаграфія ў кантэксце міжс лавянскага моўнага ўзаемадзеяння і ўзаемаўплыву (беларускі вопыт)» і «Праявы моўнай глабалізацыі ў славянскім словаўтварэнні: сутнасць, маштаб і ўплыў на сістэму».

А. А. Лукашанец з'яўляецца суаўтарам шматтомнай калектыўнай працы «Word-Fotmation. An International Handbook of the Languagy of Europe. Volume 4» (Berlin/Boston : Walter de Gruyter GmbH, 2016. 702 p.) (раздзел «Беларуская мова. Словаўтварэнне» на англійскай мове).

У манаграфіі «Праблемы беларускага словаўтварэння» (Мн., 2013) вучоны на шырокім славянскім фоне разглядае тэарэтычныя пытанні беларускага словаўтварэння, а таксама асаблівасці развіцця сістэмы беларускага словаўтварэння на сучасным этапе.

Важнае месца ў навуковай дзейнасці А. А. Лукашанца займаюць праблемы сучаснага развіцця і функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага беларуска-рускага двухмоўя. Ён з'яўляўся адным з актыўных распрацоўшчыкаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008). Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле падрыхтаваны шэраг сучасных слоўнікаў беларускай мовы, дапаможнікаў і даведнікаў, якія забяспечылі паспяховае ўвядзенне новай рэдакцыі правілаў беларускай арфаграфіі ў пісьмовую практыку і адукацыйны працэс.

Шэраг публікацый А. А. Лукашанца (напрыклад, артыкулы «Моўныя праблемы жыцця сучаснага беларускага грамадства», «Беларуская нацыянальная мова на сучасным этапе: сістэма, статус, функцыянаванне», «Дзяржаўнае двухмоўе: сутнасць і праблемы рэалізацыі» і інш.) прысвечаны даследаванню сучаснага стану беларускай мовы, яе прававога статусу і месца ў камунікатыўнай, культурнай і інфармацыйнай прасторы беларускага грамадства. У шэрагу публікацый і манаграфіі «Беларуская мова ў ХХІ стагоддзі: развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання» (Мн., 2014) ім распрацаваны і абгрунтаваны лінгвістычныя, прававыя, сацыяльна-псіхалагічныя і адукацыйныя аспекты функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага двухмоўя, што мае важнае значэнне для падтрымання нацыянальнага прэстыжу беларускай мовы ў грамадстве і гарманізацыі сферы моўнага жыцця беларускага соцыуму.

Значны ўклад А. А. Лукашанца і ў сучасную славістыку. Ён з'яўляецца старшынёй Беларускага камітэта славістаў і забяспечвае дастойны ўдзел беларускіх вучоных у міжнародных з'ездах славістаў. У 2008–2013 гг. ён узначальваў Міжнародны камітэт славістаў і займаўся падрыхтоўкай

і правядзеннем XV Міжнароднага з'езда славістаў у 2013 годзе ў Мінску. Гэты з'езд, у рабоце якога прынялі ўдзел больш за 500 вучоных з 34 краін свету, адбыўся на высокім навуковым і арганізацыйным узроўні і атрымаў шырокі станоўчы рэзананс у Беларусі і за яе межамі. З 1996 года А. А. Лукашанец з'яўляецца членам камісіі па славянскім словаўтварэнні пры Міжнародным камітэце славістаў, а з 2008 года ўзначальвае яе.

А. А. Лукашанец вядзе вялікую навукова-арганізацыйную дзейнасць, значную ўвагу ўдзяляе падрыхтоўцы філалагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яго навуковым кіраўніцтвам падрыхтаваны і абаронены 16 кандыдацкіх дысертацый. А. А. Лукашанец – старшыня савета па абароне дысертацый пры Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, член савета па абароне дысертыцый пры Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Часта выступае афіцыйным апанентам пры абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. На працягу многіх гадоў вучоны працаваў па сумяшчальніцтве прафесарам кафедры сучаснай беларускай мовы БДУ, зараз працуе прафесарам у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. З 2003 па 2005 год А. А. Лукашанец быў старшынёй экспертнага савета № 28 Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Беларусі,

Акадэмік з'яўляецца галоўным рэдактарам штогодніка «Беларуская лінгвістыка», членам рэдкалегіі часопіса «Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук», бюро Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, камісіі па найменаванні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак г. Мінска Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Міжнароднага камітэта славістаў, Рабочай групы па падрыхтоўцы прапаноў па прыярытэтных фундаментальных даследаваннях дзяржаў – удзельніц СНД, Камісіі НАН Беларусі па гісторыі навукі, Бюро Навуковага савета па кнігавыданні Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук і інш.

А. А. Лукашанец з'яўляецца аўтарам каля 400 навуковых прац, у тым ліку 14 манаграфій (3 аднаасобных і 11 калектыўных, з іх – 4 за мяжой), 4 слоўнікаў (у суаўтарстве), 11 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў (у суаўтарстве). Больш сарака прац вучонага апублікаваны ў замежных выданнях. Ён з'яўляецца навуковым рэдактарам больш сарака навуковых прац (манаграфій, навуковых зборнікаў, слоўнікаў, вучэбных дапаможнікаў).

Навуковая, навукова-арганізацыйная і асветніцкая дзейнасць А. А. Лукашанца атрымала высокую ацэнку грамадскасці і дзяржавы. Ён узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2019), Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2003, 2008, 2017), Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2004, 2014), Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2006), Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2011), Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2013), Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (2017), Мінскага гарадскога савета дэпутатаў (2017), Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2018); нагрудным знакам «Юбілейны медаль «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2009), памятным знакам «У гонар заснавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2014), памятным знакам «У гонар 90-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2018); з'яўляецца лаўрэатам прэмій Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за 2001 і 2011 гады.

Свой 65-гадовы юбілей А. А. Лукашанец сустракае ў росквіце творчых сіл, поўны энергіі і навуковага пошуку. Калегі па працы і сябры віншуюць Аляксандра Аляксандравіча з юбілеем і жадаюць плёну ў працы на карысць беларускай дзяржавы, беларускай гуманітарнай навукі і беларускай мовы.

*Акадэмік А. І. Лакотка*